Работніца і Калгасніца Беларусі

№13.
1936г.

№ 1
1936

Цэнтральны камітэт ВКП(б) і совет народных камісараў Саюза ССР з глыбокім жалем паведамляюць аб смерці вялікага рускага пісьменніка, геніяльнага мастака слова, беззаветнага друга працоўных, барацьбіта за перамогу комунізма—таварыша Алексея Максімавіча Горкага, паследаваўшай у Горках, недалёка ад Масквы, 18 чэрвеня 1936 года.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВКП(б).
СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР.



МАСКВА, РЭДАКЦЫІ „ПРАВДА“, ПРАЎЛЕННЮ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ.

ЦК КП(б)Б і ўвесь працоўны народ БССР глыбока сумуюць разам з працоўнымі ўсяго Совецкага Саюза ў сувязі са смерцю вялікага пролетарскага пісьменніка і беззаветна адданага друга народаў вялікага Совецкага Саюза Алексея Максімавіча Горкага.

Імя Алексея Максімавіча непарыўна звязана з барацьбой рабочых і працоўных усіх краін супроць сваіх прыгнятальнікаў.

Сваімі высокамастацкімі, таленавітымі творамі, насычанымі пафасам рэволюцыйнай барацьбы, Горкі „моцна звязаў сябе з рабочым рухам Расіі і ўсяго свету“ (ЛЕНІН).

Горкі на працягу ўсяго свайго жыцця з гонарам нёс сцяг пісьменніка-рэволюцыянера, чыё жыццё і талент служылі вялікай справе рабочага класа і сялянства. У цяжкія гады царызма, у перыяд пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва Алексей Максімавіч сваім вялікім мастацкім словам абуджаў у сэрцах працоўных вогненную нянавісць да ворагаў пролетарыята і ўсіх працоўных.

Алексей Максімавіч ва ўсіх сваіх творах нястомна натхняў працоўных на барацьбу, на геройства, на найвялікшыя перамогі. Яго слова, слова вялікага пісьменніка—роднае, самае блізкім народным масам вялікага Совецкага Саюза. Працоўны народ Совецкай Беларусі, як і ўвесь цалкам народ Совецкага Саюза, кіруемы геніем вялікага Сталіна, па вартасці ацаніў велізарныя заслугі Алексея Максімавіча Горкага ў барацьбе за пролетарскую рэволюцыю, за пабудову бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

Пад кіраўніцтвам Алексея Максімавіча Горкага выросла і ўмацавалася самая перадавая ў свеце совецкая літаратура і яе слаўны атрад—пісьменнікі Совецкай Беларусі.

Народ Совецкай Беларусі пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна прыкладзе ўсе свае сілы, каб узняць на яшчэ большую вышыню літаратуру Совецкай Беларусі ў барацьбе за справу соцыялізма, якой аддаў сваё жыццё Алексей Максімавіч Горкі.

ЦК КП(б)Б.

Инв. № 112
3 ок 1
1844

СВЯТА СОВЕЦКАГА НАРОДА

Т. Дындзін—нам. заг. сельгасаддзела ЦК КП(б)Б.

Совецкая Беларусь сустракае сваю 16 гадавіну вызвалення ад польскіх акупантаў—белабандытаў якія імкнуліся ператварыць Беларусь у сваю калонію, а беларускі народ у рабоў, як гэта яны зрабілі з Заходняй Беларуссю.

Толькі год прайшоў, як наша совецкая ордэнаносная рэспубліка была ўзнагароджана вышэйшай узнагародай Саюза—Ордэнам Леніна, а сёння яна мае ўжо больш сотні герояў, на грудзях якіх красуецца ордэн.

Сталінская Канстытуцыя перамогшага соцыялізма адкрывае новую старонку ў гісторыі чалавецтва. Праект новай Канстытуцыі Совецкага Саюза, распрацаваны па ініцыятыве і пад непасрэдным кіраўніцтвам вялікага Сталіна,—факт усветна гістарычнага значэння.

Сталінская Канстытуцыя з'яўляецца самай дэмакратычнай Канстытуцыяй ва ўсёй гісторыі чалавечага грамадства.

Сталінская Канстытуцыя з'яўляецца законам непарушных заваяванняў працоўных мас, сусветным доказам магутнага росквіта творчых сіл усіх народаў, насяляючых Совецкі Саюз.

Сталінская Канстытуцыя забяспечвае далейшы росквіт нябачанай у гісторыі культуры, шчаслівага радаснага жыцця і актыўны ўдзел усіх працоўных у кіраўніцтве краінай Советаў, у будаўніцтве соцыялізма і комунізма, у пабудове бясклясавага грамадства ў нашай краіне.

З захапленнем спаткаў увесь Совецкі Саюз Праект новай сталінскай Канстытуцыі. Асабліва радасна сустрэлі яго працоўныя жанчыны. Жанчына краіны Советаў карыстаецца не толькі правамі на роўную працу і аплату яе нараўне з мужчынай, на адпачынак і адукацыю, на дзяржаўную абарону яе інтарэсаў, як мацеры. „Жанчыны карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі нараўне з мужчынамі".

А якое становішча жанчыны ў капіталістычным свеце? Жанчына ў краінах капітала бяспраўна. Фашысты Германіі заяўляюць: „палітыка і прафесія—не для жанчын".

Жанчына-работніца ў капіталістычных краінах пазбаўлена права ўдзелу ў палітычным і грамадскім жыцці. Заробак жанчыны роўны ў лепшым выпадку 40-50 процантам заробка яе таварыша па працы—мужчыны. Жанчыны зусім пазбаўлены выбарчых правоў у Балгарыі, Грэцыі, Італіі, Румыніі, Партугаліі, Швейцарыі, Югаславіі, краінах Паўднёвай Амерыкі і, нават, у свабодалюбівай Францыі.

Становішча жанчыны ў капіталістычным свеце з году у год пагоршваецца. Паводле даных англійскага журнала „Медыкал рэкорд", у Германіі з прыходам да ўлады фашыстаў моцна ўзрасла прастытуцыя.

Аналагічнае становішча жанчыны і ў фашысцкай Японіі. Толькі за адну восень 1934 года там было прадана ў публічныя дамы 14.000 дзяўчат-падлетка ў з галадаючых вобласцей.

Прыведзеных фактаў даволі для таго, каб паказаць, што жанчына ў капіталістычным свеце—тавар, якім гандлююць. Многія буржуазныя законы прадугледжваюць спецыяльна пытанне, па якому жанчына, вышаўшая замуж, знімаецца з работы. Замужняя пазбаўляецца права на прафесію. Нават у цылівізаванай Англіі закон дае права мужчыне біць сваю жонку.

Зусім адваротнае мы бачым у нашай совецкай краіне, дзе пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ўлада знаходзіцца ў руках рабочых і сялян.

Совецкая жанчына ўсё больш планамерна і паўсённа ўцягваецца ў грамадскую працу. Да канца другой пяцігодкі ў народнай гаспадарцы будзе ўздельнічаць 9.854.000 жанчын—33,9 процантаў усіх рабочых і служачых. І зараз, з зацверджаннем закона аб забароне абортаў, павелічэннем матэрыяльнай дапамогі рожаніцам, устанаўленнем дзяржаўнай дапамогі многасямейным, пашырэннем сеці радзільных дамоў, дзіцячых ясляў і дзіцячых садоў, узмацненнем крымінальнага пакарання за неплацеж аліментаў і т. д., удзельная вага жанчыны яшчэ больш узнімаецца.

Над Совецкай Беларуссю свеціць сонца свабоды, шчасця. На палях гудуць трактары, камбайны. Стаханаўскія звенні і брыгады пакрылі соцыялістычныя палі. Увесь народ ахоплен энтузіязмам гераічнай працы. Беларускі народ, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, мае сваё сучассе і бачыць сваю будучыню. А там, у Заходняй Беларусі, народ мае замест свайго сёння—фашысцкую турму, голад, закрыццё школ ды экзекуцыі.

Шаснаццатую гадавіну вызвалення беларускі народ сустракае з асаблівай любоўю да свайго роднага Сталіна. Асаблівым гонарам для беларускага народу павінен быць той факт, што ў Совецкай Беларусі 28 лепшых жанчын сельскай гаспадаркі носяць ордэны краіны Советаў.

Услед за лепшымі жанчынамі—героямі працы ў актыўнае жыццё ўключыліся жоны спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Жонка агранома, зоатэхніка, дырэктара соўгаса, МТС і іншых работнікаў стала актыўным удзельнікам будаўніцтва соцыялізма.

Совецкая жанчына, поплеч з мужчынай, будуе соцыялістычнае грамадства. У сваім звароце да ўсіх жонак гаспадарнікаў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі БССР удзельніцы ўсебеларускай нарады іх заявілі наступнае:

— Наша месца там, дзе патрэбны сталінскія клопаты аб чалавеку. Мы далучаемся для клятвы удзельнікаў Усесаюзнай нарады жон гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў цяжкай прамысловасці быць самымі адданымі памочнікамі партыі і ўраду ў іх клопатах аб жывым чалавеку.

Гэты магутны заклік совецкіх жанчын дайшоў да кожнага соўгаса, кожнай МТС. Зараз задача ўсіх грамадскіх арганізацый заключаецца ў тым, каб рух жон спецыялістаў сельскай гаспадаркі зрабіць масавым рухам.

Беларусь—напярэдадні ўборкі багатага ўраджаю. Барацьба за ўборку ўраджаю—рашаючы этап гаспадарчага году.

Трэба жанчынам калгасаў і соўгасаў паказаць, што барацьба за заможнае, шчаслівае, радаснае жыццё ёсць права іх гонару, доблесці і геройства.

Грамадзянка Совецкага Саюза

На невялікім фабрычным двары, пад блакітным небам сабралася многа рабочых і работніц. Ва ўсіх быў урачысты і святочны настрой. Вакол клумбы кветак сядзелі і стаялі.

Уважліва слухалі рабочыя, уважліва ўдумваліся ў кожнае слова вялікай сталінскай Канстытуцыі.

Калі скончылі чытаць, усе наперабой папрасілі слова. Усхвалявана выказвалі рабочыя і работніцы вялікую падзяку роднаму Сталіну за нябачаныя ў свеце клопаты і павагу да чалавека.

— Права на працу, права на адукацыю, права на адпачынак, паўтаралі ўсе.

— Так давайце-ж, дзяўчаты, весяліцца, давайце пагуляем і паспяваем,—голасна сказала Маня Сідарэнка, калі скончыўся мітынг.

Усе сабраліся вакол доўгага стала. Тут былі і моладзь, і дарослыя рабочыя. Малады хлапец накручваў нікеляваную ручку светлачырвонага патэфона, а Маня, хаваючы ўсмешку, разбінала пласцінкі.

„Сердце, тебе не хочется покоя,
Сердце, как хорошо на свете жить!.."

Дружна падпявала патэфону моладзь. Гэта быў Манін патэфон, той самы, якім, разам з граматай, урад БССР прэміраваў яе як лепшую стаханаўку ў Міжнародны жаночы дзень.

Чатыры гады працуе Маня Сідарэнка на фабрыцы. І ўвесь гэты час яна жыве радасным, шчаслівым жыццём. Ды не толькі яна адна такая шчаслівая. У нашай соцыялістычнай радзіме, дзе ўвесь совецкі народ мае права на працу, на адпачынак і на адукацыю, радасць адчувае кожны працоўны, кожны жывы чалавек.

Гэта радасць жыцця цалкам сказалася ў стаханаўскім руху. Зразумела, што Маня адна з першых на фабрыцы перайшла на стаханаўскія метады работы. Замест 800 пар гумавай падэшвы, яна выпрацоўвае 1800- 2400 і зарабляе 300—350 рублёў.

І таму так весела жывецца Мані. Апранаецца яна цяпер прыгожа і да свята 11 ліпеня добра падрыхтавался.

У клубе, дзе Маня актыўна працуе ў балетным гуртку, і ў школе сярэдняй адукацыі, дзе яна вучыцца, і ў цэху, і дома—усюды рады перамогам Мані.

А цяпер, пасля абгаварэння праекта сталінскай Канстытуцыі, Маня будзе працаваць яшчэ лепш, яшчэ больш аддана, каб апраўдаць ганаровае званне грамадзянкі вялікага Совецкага Саюза.

Лагунова.

Менск.
Абутковая фабрыка імя Кагансвіча.



Заняткі гуртка па вывучэнню англійскай мовы на менскім заводзе „Большэвік". Ля дошкі—выкладчыца т. Арэшка—жонка інжынера 2-га хромавага цэха. (Белсаюзфота).

Абмяркоўваць Канстытуцыю гонар і радасць!

Праект новай сталінскай Канстытуцыі з вялікай увагай абмяркоўвалі на сходах брыгад. Словы гэтага гістарычнага дакумента—просты і зразумелы. Яны хвалююць кожнага рабочага і работніцу. Асабліва яскрава сказана аб роўнапраў'і жанчыны і праве аб працоўных Совецкага Саюза на працу, адпачынак і адукацыю.

Я—яшчэ маладая работніца, працую на заводзе пяты год прыёмшчыцай. Хачу вучыцца. Пакуль што наведваю школу стаханаўцаў і курсы па падвышэнню кваліфікацыі. Па сканчэнні гэтых курсаў пайду вучыцца далей, каб быць добрым майстрам, ці тэхнікам. Для гэтага ў мяне ёсць усе неабходныя ўмовы.

Наш завод выпускае ланцугі Галя, без якіх не могуць працаваць ні камбайн, ні іншыя сельска-гаспадарчыя машыны.

Пленум ЦК ВКП(б) сваімі рашэннямі абавязвае нас працаваць лепш, працаваць па-новаму, каб прысці да ўборачнай кампаніі ў поўнай гатоўнасці.

Мы, стаханаўцы завода, гэта выканаем з гонарам, бо адчуваем штодзённыя клопаты нашай вялікай партыі і любімага таварыша Сталіна аб жывым чалавеку.

Гонар і радасць быць грамадзянінам соцыялістычнай радзімы і абмяркоўваць яе асноўны закон—Канстытуцыю, якая забяспечвае кожнаму працоўнаму Совецкага Саюза яшчэ лепшае жыццё, яшчэ лепшую будучыню. І таму я так шчасліва, што жыву ў краіне, дзе так многа клапацяцца аб людзях, аб нас, жанчынах.

Жыць стала лепш і весялей; мы, моладзь, поўны радасці жыцця і адданасці нашай вялікай радзіме, на якую працоўныя усяго свету глядзяць з надзеяй і любоўю.

Елена Балотнікава.

Менск,
Завод ланцугоў Галя.

Абгаварэнне праекта Канстытуцыі СССР у калгасе „Чырвоны гароднік" Менскага раена. (Белсаюзфота)

Дзеці барацьбы

Нядаўна на совецкіх экранах паявіўся новы выдатны фільм „Цырк“. У аснову гэтай хвалюючай карціны пакладзена глыбокая ідэя аб роўнасці працоўных усіх рас і нацый ў Совецкім Саюзе. Некаторыя месцы з гэтага фільма глыбока ўразаюцца ў памяць.

У белай жанчыны нарадзіўся чорны хлопчык. Яна больш не можа заставацца на Захадзе,— гэта-ж нячуваная ганьба, якую нельга змыць.

Падумайце, у белай жанчыны чорны хлопчык! І маці чорнага дзіцяці прымушана ўцякаць у СССР. Але і тут яна не гаворыць нікому пра свайго сына. Ёй усё яшчэ здаецца, што сын-негрыцёнак кладзе на яе кляймо ганьбы.

Выпадкова выяўляецца, што ў белай жанчыны—артысткі цырка—чорны сынок. Матку ахоплівае жах. Відаць і тут ёй пагражае лаянка і кіпіны. Але совецкі народ акружае чорнага слаўнага хлопчыка любоўю і ўвагаю.

Яскравы і глыбокі змест гэтай карціны ўспомніўся нам у той час, калі нядаўна ў Менск прыехалі 25 рэбят з інтэрнацыянальнага дому імя Елены Стасавай. Пасля невялікага адпачынку яны апрануліся ў добра выгладжаныя белыя касцюмы і вышлі у квітнеючы, пахнучы грушаю летні сад. Весела і іскрыста паказалі яны на лоне прыроды сваю выдатную мастацкую самадзейнасць.

У гэтай невялікай групе з 25 чалавек вы маглі сустрэць японца, паляка, італьянца, балгарына, кітайца... І ўсе яны, гэтыя дзеці барацьбы, не толькі роўныя паміж сабой, але і дружныя, але і блізкія адзін другому, як браты і сёстры ад аднае маткі.

І ўсе яны нарадзіліся за межамі Совецкага Саюза, і гэтыя 25, і тыя 125, што засталіся каля Івана-Вазнесенска ў сваім прыгожым асабняку, пабудаваным спецыяльна для дзяцей. Яны прыехалі ў нашу краіну хто з-за акіяна, хто з далёкага востраваКуба, хто з абмываемай морам. Японіі, хто з гарачай Італіі.

Усе яны нарадзіліся за межамі Совецкага Саюза, але для ўсіх іх СССР стаў любімай радзімай.

Якая багатая біяграфія у маленькіх грамадзян гэтай інтэрнацыянальнай сям'і, што налічвае 30 нацыянальнасцей!..

Пра кожнага з іх, пра іх бацькоў, матак, братоў, сёстраў, прыяцеляў можна было-б напісаць хвалюючую кнігу, да таго глыбокімі былі перажытыя імі ў барацьбе пакуты, да таго упартай была іх барацьба... У большасці гэтых дзяцей крывавая рука фашызма вырвала бацькоў, матак, сёстраў, братоў, а іх саміх, галодных і замучаных, выкінула на гарадскі брук бяспрытульнічаць! галадаць.

* * *

У тым, што мы расказваем ніжэй, нічога не выдумана. Нам перадаў гэта запавяданне з хваляваннем у голасе, са слязмі на вачах, 16-гадовы Мідко—кучаравы балгарын, стройны і задумлівы юнак...

Яны жылі ў невялікім балгарскім гарадку дружнай сям'ёй... Бацька—ён быў пажылым ужо, але выглядаў маладым і бадзёрым. А маці, як і ўсе маткі ў свеце, заўсёды была заклапочана тым, каб дзеці на спазніліся ў школу з-за снедання, каб у час згатаваць абед. Але ў вольную хвіліну яна клікала Мідко і расказвала яму:

— Ведаеш, сынок, акрамя Балгарыі ёсць яшчэ краіны. Я вельмі хацела-б, каб ты паехаў вучыцца ў Совецкі Саюз, як падрасцеш! Ах, Мідко, ты яшчэ маленькі, а я столькі-б цудоўнага магла расказаць табе пра гэту краіну... Мне казаў бацька...

Бацька Мідко быў па прафесіі цырульнікам, але цырульная справа вельмі мала цікавіла яго... Яшчэ з дзіцячых гадоў яго непакоіла думка пра вызваленне балгарскіх працоўных, і ён, прыкрываючыся сваёй нявіннай цырульняй, усё жыццё аддаваў справе рэволюцыі.

Акрамя Мідко ў сям'і раслі яшчэ брат і сястра.

Мідко вучыўся, і бацька стараўся з усіх сіл, каб даць адукацыю сыну!

Так жылі яны да адной жахлівай ночы, калі прышоў канец усёй сям'і балгарскага цырульніка...

Успамінаючы гэту ноч, Мідко задыхаецца ад хвалявання.

Да іх на кватэру, бразгаючы шпорамі і моцна лаючыся, уварвалася некалькі жандараў.

— Дзе гаспадар?

— Спіць,—адказала маці, не трацячы знадворнага спакою.

І праз некалькі хвілін яны павялі з сабою непаспеўшага апрануцца бацьку... А праз тры дні жандар увайшоў у калідор і кінуў на падлогу клумак з вопраткай... Гэта быў бацькаў касцюм... Яго ўжо не было ў жы-

Дзеці інтэрнацыянальнага дома імя Стасавай у садзе мінскага дома палітэмігрантаў.

(Белсаюзфота).

вых. Паношаны касцюм—вось як балгарская паліцыя паведаміла пра зверскае забойства...

Расправіўшыся з рэволюцыянерам, пачалі праследваць яго сям'ю. Мідко выгналі са школы, старэйшага брата давялі да незлячымай хваробы і ён хутка памёр. Памёрла і сястра. А маці, маці звар'яцела.

Мідко астаўся адзін. Абадраны і брудны, блукаў ён па гарадскіх вуліцах, не ведаючы, што з ім будзе заўтра...

Неўзабаве збыліся матчыны лятуценні... У 1929 годзе Мідко прыехаў ў Совецкі Саюз. Замучаны, выбіты з каляіны нармальнага жыцця хлопчык зусім перарадзіўся. Совецкі Саюз замяніў яму не толькі радзіму, але і матку і бацьку... З якой сілай і паўнатой спраўдзілася ўсё тое, што расказвала матка пра гэту цудоўную краіну!

Мідко знайшоў тут дружны калектыў таварышоў. Перад ім шырока адчыніліся дзверы ў школу. Ужо з юнацкіх гадоў ён можа даць сваім рукам вытворчы навык ў спецыяльных майстэрнях. Ён уступіў у комсамол, і комсамол уцягвае яго ў актыўнае грамадскае жыццё...

Жыццё Мідко падобна на жыццё Густава з Кенігсберга і Чы-чу з Кантона, і Лёлі з Паўднёвай Славіі. Як і ён, яны толькі ў Совецкім Саюзе адчулі паўнату дзіцячай радасці і веліч бацькоўскага клопату.

25 юных інтэрнацыяналістаў прыехалі да нас у БССР адпачываць. Два сонечных летніх месяцы прабудуць яны на беразе рэчкі Сож, у Чонках. Трое з гэтых рэбят застануцца жыць у БССР і будуць далей вучыцца ў школе.

Беларусь, партыяй Леніна—Сталіна адроджаная да жыцця, да вялікай творчай будаўнічай работы, выхоўвае сваіх адважных сыноў і дачок—інтэрнацыяналістаў, да апошняй кроплі крыві адданых справе свайго класа. Такімі будуць і гэтыя трое!

Ёфім Садоўскі.

У ЛАГЕРЫ акцябраў

(Нарыс)

ГАРАДОК НА ПАЛЯНЦЫ.

Цішыня, спакой. Дождж перастаў і ў лесе пачуўся спеў птушак, кукаванне зязюлі. Паветра чыстае, дыхаецца лёгка.

У будынках ні аднаго моцнага гуку. Толькі трохі воддаль ад дамоў чуецца бразганне відэльцаў і талерак. Гэта на кухні рыхтуюць снеданне адпачываючым рэбятам. Хутка яны ўстануць і ўсё павінна быць гатова, каб не чакалі рэбяты дарма ў сталовай. А сталовая, трэба сказаць, слаўная: невялікія сталы на чатырох чалавек, засланыя цыратай, крэслы, навокал чыстата, парадак.

Гэта акцябрацкі лагер імя Косарава. На шырокай палянцы, паміж Калодзішчамі і Гарадзішчам, стаяць 7 новапабудаваных жылых дамоў, адзін з іх (самы лепшы і прыгажэйшы) пабудаван сёлета. Далей — сталовая, леднік, кладоўка. Гэта цэлы гарадок, толькі не хапае клуба, радыё. Але клуб хутка пачнуць будаваць і другая змена ўжо будзе праводзіць свой час у даждлівае надвор'е за гульнямі ў крытым памяшканні.

Тут адпачываюць 280 рэбят з менскіх гарадскіх школ, лепшых выдатнікаў вучобы. Ёсць тут і рэбята, слабейшыя па здароўю.

РАДАСЦЬ НА КОЖНЫМ КРОКУ

Гоман, песні, смех—гэта першы ранішні сігнал.

Весела і цікава жывецца тут рэбятам!

На валейбольнай пляцоўцы Лёня Пікулік і Міця Офштэйн, падабраўшы сабе кампаньёнаў, гуляюць у валейбол. Трохі далей рэбята гуляюць у мяч.

А тым часам масавік Валя вынесла два крэслы, паклала паміж іх мяч і наладзіла атракцыён. Кожнаму дзіўна, як гэта не можа выбіць мяч яго таварыш з завязанымі вачыма. Паспрабуе сам і выходзіць тое-ж самае. Выбіўшыя мяч тут-жа атрымліваюць прызы—цукеркі, або пячэнне.

У лагеры ёсць два гурткі юных натуралістаў, балетны, харавы. Кожны з рэбят ўходзіць у той, які яму лепш спадабаецца. Найбольш—юнатаў. Хочацца ведаць—чаму адзін мох не падобен на другі, чым харчуецца вавёрка, ці ёсць ў гэтым лесе ваўкі, ці далёка цягнецца лес, як жывуць матылькі, жучкі.

З прагулкі кожны з рэбят стараецца што-небудзь прынесці з сабой. Адны нарвуць букеты кветак, паставяць іх ў сваіх пакоях, у сталоўцы, на стале. Другія—наловяць матылькоў, жучкоў, светлячка знойдуць, яшчарку выганяць і будуць доўга бегаць за ёй, пакуль не апынецца яна ў шапцы. Тады цэлым гуртам бягуць радасныя і здаволеныя паказваць здабычу педагогам—Владзіміру Пятровічу, Фане Аронаўне, або начальніку лагера, ці важатым.

СПАБОРНІЦТВА НА ПАПРАЎКУ.

5 рублёў 11 капеек ідзе на харчаванне кожнага акцябронка на дзень. Да таго-ж у лагеры ёсць свой агарод, бульба. Кормяць дзяцей сытна, па пяць разоў на дзень.

Не мала клопату тым важатым, у якіх рабята не з'ядаюць сваіх порцый. У такіх выпадках адзначаюць лепшых, раяць браць з іх прыклад. Калі нічога не дапамагае, прыстрашваюць адправіць дамоў з лагера, а гэтага рэбяты больш усяго баяцца.

— Бяда ў нас с такімі рэбятамі, што мала ядуць,—скардзіцца начальнік лагера тав. Дзятлоўская. Праўда іх не многа, але ўсё-ж непрыемна, калі адстануць ад другіх у папраўцы.

„МАЕ ЎРАЖАННІ"

(Ліст маткі).

Ірвецца матчына, бацькава сэрца да дзіцяці, хочацца праведаць, як жыве яно там, у лагеры—сярод другіх рэбят. І кожны дзень прыязджаюць бацькі сюды. Здаволеныя звяртаюцца назад. Некаторыя з іх не могуць пакінуць лагер, каб не запісаць сваіх ўражанняў. Вось адно з іх:

— „Лагер імя тав. Косарава знаходзіцца ў вельмі добрым мёсцы. Прыехаўшы сюды, я застала свайго сына вясёлым, жыццерадасным. Важатыя ўважліва



Акцябраты ў лесе.

і ветліва адносяцца да рэбят і бацькоў.

Я вельмі задаволена лагерам. Ён упаўне задавальняе маё дзіцё. Рэбята весела і культурна праводзяць свой адпачынак: спяваюць, танцуюць і гуляюць. Дзякую таварышу Сталіну і нашаму ураду ад работніцы стаханаўкі Шэйтэльман за клопаты аб нашых дзецях, за іх шчаслівае і радаснае жыццё".

ВЯЛІКІ СУМ МАЛЕНЬКІХ ГРАМАДЗЯН

Пра смерць вялікага рускага пісьменніка Алексея Максімавіча Горкага ў лагеры даведаліся назаўтра, 19 чэрвеня. Раніцай, на лінейцы педагог Фаня Аронаўна сказала рэбятам аб цяжкай утраце.

Які жаль, якое невыказнае здзіўленне прабегла па тварах рэбят! Трывожна, паціху перадавалі яны яшчэ раз адно другому: „Горкі памёр! Горкі памёр..." Яны амаль усе чыталі ўжо „Забастоўку ў Палермо", „Дзеда Архіпа і Лёньку", а некаторыя з старэйшых—і больш буйнейшыя творы. Усе ведалі пра пісьменніка.

Рэбята тут-жа пачалі даваць свае прапановы, як лепей ушанаваць памяць дарагога Аляксея Максімавіча.

— Трэба прывесіць да сцяга чорную стужку, няхай ўсе ведаюць, што мы шкадуем Горкага.

— Фаня Аронаўна, дастаньце партрэт Максіма Горкага і абвядзем яго чорнымі рамкамі.

А Эдзя Чэртова падышла зусім блізка і сказала:

— Фаня Аронаўна, давайце напішам вялікімі літарамі пра смерць Горкага і павесім ад гэтага дому, аж да таго.

— А што-ж мы напішам?

Эдзя хвілінку маўчыць. Яна думае, што напісаць.

— Напішам: „Мы, акцябраты, будзем вечна помніць Максіма Горкага",—праз момант гаворыць яна.

У гутарку ўмешваецца акцябронак Валодзя.

— І дадайце яшчэ, Фаня Аронаўна, што мы будзем добра вучыцца!

Усе згаджаюцца з гэтым.

Так жыве, так адпачывае, так адчувае самая меншая змена—акцябраты.

Ал. Пальчэўскі.

Не стала Горкага

Не стала Горкага... Памёр наш горды сокал,
Асірацела слова страсці і агня.
Не стала Горкага, але крыляць высока
Над светам будзе Горкага імя.

Не стала Горкага, мысліцеля не стала,
Зямлёй праносіцца людскога жалю гул.
Радзіму сонечную гора усхвалявала;
Народы—ў ганаровы сталі караул.

Не стала Горкага, замоўк наш буравеснік,
Слязою буйнаю ў вянку іскрыцца сум.
Я за труной тваёй іду з жалобнай песняй,
Глыбока ў сэрцы смутак свой нясу...

Не стала Горкага... **Памёр** наш горды сокал,
Асірацела слова страсці і агня.
Не стала Горкага, але крыляць высока
Над светам будзе Горкага імя.

Андрэй Александровіч.

На пахаванні тав. А. М. Горкага

Прамова тав. В. М. Молатава

Таварышы! Развітваючыся сёння з Алексеем Максімавічам Горкім, мы, яго прыяцелі, і незлічоныя чытачы—прыхільнікі, перажываем такое пачуццё, што ў кожнага з нас нейкая яркая частачка свайго ўласнага жыцця адыходзіць назаўсёды ў мінулае. Мільёны людзей перажываюць зараз гэта пачуццё. Так душэўна глыбока і непасрэдна блізка стаяў Горкі да нас, да людзей сваёй эпохі, якім ён так многа даў геніяльным мастацкім словам, сваёй бязмернай любоўю да працоўных і барацьбой за свабоднага чалавека, прыкладам усяго свайго выдатнага, непаўторнага жыцця.

Каб стаць вялікім пісьменнікам, якім мы яго ведаем, Горкі павінен быў на працягу доўгіх гадоў весці ўпартую барацьбу за тое, каб вырвацца з цяжкай галечы і гора, пачынаючы яшчэ з ранняга маленства. Яго не раз кідала на дно жыцця, дзе нямала загінула людзей з талентам, з дараваннямі. Дзеля хлеба надзенна неабходнага, яму нямала прышлося папрацаваць на капіталістаў малых і вялікіх—маляром, пекарам, канторшчыкам, грузчыкам, батраком.

Ніхто з буйных пісьменнікаў нашай краіны, ды і ў іншых краінах, не ведаў так блізка жыцця „нізоў“ народу пры капіталізме. Ніхто з іх не перажыў на сабе самім столькі лютасці і гнуснасці з боку паноў—эксплаататараў. Ніхто з іх нават проста не бачыў сваімі вачыма столькі замучаных паднявольнай працай і забітых гнётам капітала, як наш Горкі, у якога ўсё гэта выкавала непрымірымасць і рэволюцыйную нянавісць да капіталістычнага ладу і беззаветную веру ў вызваленчую сілу комунізма.

Вось чаму рабочыя і ўсе працоўныя бачаць ў Горкім сябе свайго чалавека, сваё жыццё, лёс, сваё будучае. Вось чаму Горкага так любілі, любяць і будуць любіць працоўныя нашай краіны і працоўныя іншых краін.

Горкі стварыў бяссмертныя вобразы людзей свайго часу.

Незгладжальна астаюцца ў памяці яго мастацкія фігуры капіталіста—драпежніка нажывы, затхлага мешчаніна правінцыяльнай глушы, самаўлюблёнага буржуазнага інтэлігента-паразіта і іншых паноў старой, дарэволюцыйнай Русі. Пролетарскі пісьменнік Максім Горкі загляну ў у самую іх душу і раскрыў у сваіх творах іх соцыяльную прыроду прыгнятальнікаў народных мас.

Ён нямала даў жывых і моцных прыкладаў таго, да якога падзення і нікчэмнасці звярыная сістэма капіталізма даводзіла і некаторых выхадцаў з буржуазных слаёў, якія скаціліся ў разрад няўдачнікаў.

Разам з тым Горкі, як вялікі мастак пролетарыята, даў выдатныя вобразы свабодалюбівых і самаадданых людзей, якія не мірацца з гнётам і тванню жыцця, даў лепшыя і найвыразнейшыя вобразы пролетарскіх рэволюцыянераў, сагрэтыя цеплынёй шчырага пачуцця геніяльнага мастака.

У Максіма Горкага многа мільёнаў чытачоў і прыхільнікаў. Рады іх будуць яшчэ доўга расці і расці.

Па сіле свайго ўплыву на рускую літаратуру Горкі стаіць за такімі гігантамі, як Пушкін, Гогаль, Талстой, як лепшы прадаўжальнік іх вялікіх традыцый у наш час. Уплыў мастацкага слова Горкага на лёс нашай рэволюцыі непасрэдней і мацней, чым уплыў якога-небудзь іншага нашага пісьменніка. Таму іменна Горкі і з'яўляецца сапраўдным роданачальнікам пролетарскай соцыялістычнай літаратуры ў нашай краіне і ў вачах працоўных усяго свету.

Сваімі асобнымі шляхамі прышоў вялікі мастак Максім Горкі ў рады байцоў за комунізм. Увайшоў ён у нашы рады яшчэ да рэволюцыйнага ўздыму 1905 года, але ўжо з разгорнутым сцягам буравесніка рэволюцыі.

Горкі пачаў сваё рэволюцыйна-літаратурнае жыццё ў эпоху нарастання рэволюцыйнага ўзрыву і хутка цалкам і арганічна стаў па пазіцыі рабочага класа, стаў блізкім другам вялікага Леніна па барацьбе за комунізм.

Веліч Горкага ў тым, што яго светлы розум, бязмежная любасць да народу і самаадданая гіганцкая праца над асваеннем дасягненняў культуры чалавецтва зрабілі яго беззаветным другам працоўных, вялікім натхніцелем барацьбы за справу комунізма.

Да апошняга ўздыхання Горкі жыў аднымі пачуццямі і мыслямі з тымі, хто з такім энтузіязмам будуе цяпер новае, соцыялістычнае грамадства пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Яго вочы да канца дзён жыцця бліскалі агнямі барацьбы і непрымірымасці да ворагаў працоўных, да фашыстаў і да ўсіх іншых прыгнятальнікаў, да душыцеляў культуры і падпальшчыкаў вайны.

Кожнаму поспеху працоўных ў нашай краіне, поспехам стаханаўцаў, новым формам руху сярод жанчын, росту ўраджаяў і прадукцыйнасці працы, выкрыццю вылазак і падвохаў з боку ворага і ўмацаванню абароны краіны, і асабліва культурнаму росту мас, росту літаратуры і мастацтва, ён радаваўся як палкі юнак і як мудры бацька.

Прыклад Горкага многаму нас вучыць.

Горкі—геніяльны мастак слова.

Літаратарам, мастакам слова гэты прыклад паказвае сілу слова, калі гэта слова служыць барацьбе за шчасце чалавека і чалавецтва, калі гэта слова дахо-дзіць да сэрца людзей і народаў.

Горкі—вялікі сын вялікага народу.

Простым людзям, працоўным прыклад Горкага паказвае, што наш народ, як і іншыя народы, багат слаўнымі талентамі, якім раней толькі ў выключных выпадках удавалася вырвацца з-пад спуда, а цяпер—адкрыт вольны шлях да росквіту, да перамог і славы.

Горкі—беззаветны друг працоўных і натхніцель барацьбы за комунізм.

Ці патрэбны яшчэ доказы, што лепшыя людзі чалавецтва, дасягнуўшыя вяршыні культуры і глыбокага разумення затоенай мары народаў аб сваім шчасці, беззаветна, без астатку аддаюць свае сілы справе комунізма і ў гэтым бачаць сваё вышэйшае задаваленне.

Адно гэта гаворыць за тое, што справа комунізма на шляху да сваёй поўнай перамогі.

Пасля Леніна смерць Горкага—самая цяжкая ўтрата для нашай краіны і для чалавецтва.

Наша сіла ў тым, што народ совецкай краіны, якому Горкі аддаў увесь свой вялікі талент і вялікае сэрца, падняўся ўжо на свае магутныя ногі, даў прастор росту сваіх бязмерных сіл і талентаў і тым самым пераможна ператварае ў жыццё надзеі і мары лепшых прадстаўнікоў чалавецтва.

МАКСІМ ГОРКІ

Песня пра Буравесніка

Над раўнінай мора вецер хмары чорныя збірае. Паміж хмарамі і морам горда кружыць буравеснік, да маланак сам падобны.

То крылом кранае хвалі, то стралой ляціць ў неба, ён крычыць—і хмары чуюць у адважным крыку радасць.

Гэты крык—жаданне буры! Дужасць гневу, пал агністы і ўпэўненасць у пабедзе чуюць хмары ў гэтым крыку.

Чайкі стогнуць перад бурай,—стогнуць, кружацца над морам і на дно яго гатовы захаваць свой жах ад буры.

І гагары так-жа стогнуць,—ім, гагарам, недаступна захапляцца так змаганнем: гром ударaў іх пужае.

Неразумны пінгвін цела ад навал хавае ў скалы... Толькі горды буравеснік кружыць смела і адважна над сівым ад пены морам.

І ніжэй чарнеюць хмары, апушчаюцца над морам, і спяваюць, рвуцца хвалі ў вышыню насустрач грому.

Гром ракоча. Стогнуць хвалі ў пене гневу ў спрэчках з ветрам.

Вось ахоплівае вецер хваль чароды ў абдымкі і кідае іх з размаху ў дзікай злосці на каменне, разбіваючы на пырскі змарагдовыя магуты.

Буравеснік з крыкам кружыць да маланак сам падобны, як страла нізае хмары, пену хваль крылом зрывае.

Вось ён носіцца, як дэман,—горды, чорны дэман буры,—і смяецца, і рыдае... Ён над хмарамі смяецца, ён ад радасці рыдае.

У грымотах—чуткі дэман,—ён даўно утому чуе, пэвен ён, што не схаваюць хмары сонца, не схаваюць!

Вецер вые... Гром ракоча...

Сінім полымем пылаюць над бяздоннем мора хмары. Мора ловіць стрэл маланак і ў сваім прадонні тушыць. Быццам вогненныя змеі ўюцца ў мора і знікаюць адлюстроўкі тых маланак.

— Бура! Хутка грымне бура!

Гэта смелы буравеснік горда кружыць між маланак над бурлівым гнеўным морам, то крычыць вяшчун пабеды:

— Хай мацней ударыць бура!

Пераклад Пятра Глебкі.

Рацуная дачка вялікай радзімы

Была нясцерпная гарачыня. Сонца пякло неўмаліма. Тэрмометр паказваў 75 градусаў вышэй нуля. Паўднёва-ўсходні вецер „афганец“ уздымаў слупы пяску. Пясок трапляў у лёгкія, у вушы, у нос...

Але пара коней упарта цягнула наперад маленькі вазок па гэтым неабсяжным сярэднеазіяцкім стэпу.

У сыпучых пясках спыняліся калёсы, коні падалі ад знямогі і тут-жа падымаліся, каб ісці далей.

Валенціне здавалася, што канца не будзе гэтай жахлівай паездцы. Заплюшчыўшы вочы і абхапіўшы галаву рукамі, яна спрабавала драмаць. Але белы шаль—неабходная абарона ад сонца—гарачым абручом паліў галаву.

Па дарозе сустракаліся оазісы—населеныя пункты, або адзінокія групы дрэў з арыком, ці возерам. Некалькі разоў вознік уга-варваў Літвіненка спыніцца і адпачыць, але яна спяшалася. На Украіне Валенціна пакінула ў бацькоў дваіх дзяцей і паехала сюды таму, што тут быў ён—муж яе—камандзір, пільны вартавы на совецкай граніцы.

Бацькі, ды ўсе прыяцелі ўгаварвалі Валенціну не ехаць.

— Што ты там рабіць будзеш? Там басмачы, жыць небяспечна, а яму ты толькі перашкаджаць будзеш.

Але Валя стаяла на сваім. Яна ведала, што муж яе з поспехам адбівае налёты басмачоў на нашу граніцу. Ведала яна і тое, што перашкаджаць яму ніколі не будзе.

— Дапамагаць буду яму там,— рашуча заявіла маладая жанчына і хутка сабралася ў дарогу.

Розныя думкі не давалі супакою Валенціне, але ўсё перамагала ўпартае імкненне наперад.

— Хутчэй-бы, хутчэй!

Дарога цягнулася бясконца доўга. Валенціна перастала ўжо лічыць час.

Але вось скончыліся пяскі і пачаліся балоты, чарот.

— Цяпер ужо хутка,—праразаў нудную цішыню вознік.

І сапраўды, праз некаторы час у далечы паказаліся вароты пагранічнай заставы. Сустрэў іх памочнік начальніка заставы.

Мягкім, нібы прасіўшым прабачэння голасам, ён расказаў прыезджай жанчыне, што муж яе—начальнік заставы—паехаў з атрадам чырвонаармейцаў у пагоню за бандай басмачоў, якая прабралася цераз граніцу.

Няпрыветлівы здаўся Валенціне пусты пакой. Чыстата тут давяршала адчуванне бязлюддзя і закінутасці.

Тры дні не варочаўся атрад. Тры начы не спала Валенціна. Выцягнуўся і пахуднеў кволы дзіцячы тварык, а стройная дзявочая фігурка стала яшчэ танчэйшай.

Непрыкметна для сябе самой Валенціна за гэтыя доўгія дні чакання зблізілася з усім калектывам пагранічнікаў. Таварыскай цяплынёй і братнімі клопатамі акружылі чырвонаармейцы жонку свайго камандзіра, якая не пабаялася прыехаць на гэту далёкую заставу.

Цэлыя дні пры людзях жанчына трымала сябе вельмі роўна, спакойна, але вечарам сум ахопліваў яе. Доўга глядзела яна на быструю Аму-Дар'ю, нібы чакаючы ад бурлівай ракі адказу на непакоіўшае пытанне: дзе-ж ён?

Нарэшце атрад вярнуўся. Вярнуўся і ён, любы, доўгачаканы.

Банда басмачоў была разбіта.

Але радасць Валі цягнулася нядоўга. Праз некалькі дзён прышлося яе мужу памчацца зноў у пагоню за новай бандай.

Развітанне было кароткім. Ён зняў з сцяны вінтоўку, паказаў ёй, як трэба страляць і глуха дадаў:

— Беражы сябе. Адстрэльвайся! Калі здарыцца што-небудзь, усе будуць заняты, можа не будзе каму абараніць цябе.

Сэрца жанчыны білася часта. Страх за мужа прыдушыў яе. А тут яшчэ гэта вінтоўка! Рука дрыжэла, калі яна ўзяла ў рукі зброю. Як-жа яна будзе страляць? Ці-ж гэта жаночая справа?

Цяпер Валенціна Якаўлеўна з усмешкай успамінае сваю баязлівасць перад вінтоўкай. Выдатны стралок, яна ўмее абыходзіцца з рознай зброяй, а муж яе, камандзір Літвіненка, з гордасцю заяўляе, што Валенціне можна даручыць любое баявое заданне. Школу яна прайшла, як чырвонаармеец. І верхавой яздзе навучалася ў страю разам з усімі байцамі.

І ніякай палёгкі, ніякіх уступак не робіць ёй камандзір Літвіненка ў страю. Зваліцца Валенціна з каня, толькі ўсхопіцца на ногі, а ўжо чуваць голас камандзіра.

— Даганяй каня, не зявай!

І праз некалькі хвілін Валенціна ўжо ў страю і дакладна выконвае камаду.

— Вольт налева!.. Вольт направа!..

Цяпер камандзір Літвіненка—начальнік адной з застаў на заходняй граніцы Совецкага Саюза. І камандзір атрада, і жонка яго, і двое іх хлопчыкаў моцна звязаны з чырвонаармейцамі сваёй заставы. Цяпер хлопчыкі ў лясной школе ў Станькаве. Палац

графа Чапскага ніколі не быў такім прыгожым, як цяпер. Тут знаходзіцца і інтэрнат вучняў.

Пасля прадукцыйнай вучобы 12-гадовы і 10-гадовы хлопчыкі варочаюцца на канікулы дамоў у заставу, дзе іх чакаюць не толькі бацька і маці, але і ўсе чырвонаармейцы. Любімыя заняткі малых—ездзіць конна і разам з байцамі купаць коней.

— Ды і страляюць яны не горш за мяне, толькі з дробнакалібернай вінтоўкі,—з гордасцю заяўляе маці.

Валенціна Якаўлеўна разам з чырвонаармейцамі гатова даць адпор ворагу, калі ён адважыцца паткнуць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод. Але сёння, калі на граніцы спакойна, гэта жанчына ўсе сілы свае аддае на тое, каб зрабіць жыццё нашага чырвонаармейца яшчэ больш культурным і лепшым.

Яна дапамагае палітсаставу весці літаратурны гурток, чытку газет. Валенціна Якаўлеўна карыстаецца сярод чырвонаармейцаў вялікім аўтарытэтам.

Адзіная жанчына на заставе, яна адчувае адказнасць за знадворны выгляд чырвонаармейца. Неакуратна падшыты каўнерык, дрэнна падагнаная да фігуры гімнасцёрка, падраныя на занятках штаны—ўсё гэта з'явы, на якія не можа спакойна глядзець Валенціна Якаўлеўна. Не чакаючы прыезда атраднага краўца, яна і штаны залатае і гімнасцёрку пераробіць і каўнерык прышываць навучыць. І за мужам сочыць, каб хадзіў акуратным, чыста выбрытым і паказваў прыклад чырвонаармейцам.

Клопаты аб чырвонаармейскай сталовай Валенціна Якаўлеўна лічыць за свой абавязак. Быў час, калі меню, якое прысылае атрад, аставалася не скарыстаным толькі таму, што павары на заставе не ведалі, як гатаваць складаныя блюды. Затое цяпер Валенціна Якаўлеўна навучыла іх гатаваць і рагу, і блінчыкі, і адбіўныя, і шмат іншых смачных і сытных блюд.

Кожны дзень у чырвонаармейскай сталовай падаецца абед з трох блюд. На трэцяе—кампот, кісель ці запяканка з падліўкай. Часта чырвонаармейцы атрымліваюць на снеданне какао, цукеркі да чаю. І ўсё гэта, дзякуючы старанням Валенціны Якаўлеўны.

Шмат чаго зрабіла ў гэтым кірунку тав. Літвіненка.

На заставе ёсць вялікі сад. Разам з чырвонаармейцамі сабрала Валенціна Якаўлеўна ўсю садавіну, насушыла яе, намачыла яблыкаў. Агуркоў таксама насаліла.

Але для салодкіх блюд трэба многа цукру, і Валенціна Якаўлеўна знайшла выхад. Пры яе дапамозе выкармілі на заставе свіней, прадалі парасят, а на гэтыя грошы купілі цукру, какао, цукерак.

Валенціна Якаўлеўна адчувае сябе гаспадыняй на заставе і вядзе яна сваю гаспадарку выдатна. І таму да яе яшчэ большая павага акружаючых, і таму яшчэ, больш чулая дружба мужа.

Такіх, як тав. Літвіненка, у нас не мала. І тав. Іванова з Цімкавіцкага атрада—арганізатар гуртка варашылаўскіх кавалерыстаў, і тав. Саулгодзе з Жыткавіцкага атрада, і тав. Сільвестрава—член камсода менскай 4-ай школы, і тав. Лоцманава, загадчыца Цімкавіцкага дзетсаду і многа, многа іншых.

Усё гэта—адданыя дачкі сваёй вялікай радзімы, якія ведаюць, што няма большага гонару, як ахоўваць спакой нашых свяшчэнных граніц, спакой вялікага совецкага народа. Яны ведаюць таксама, што быць супольнікам і памочнікам камандзіра-пагранічніка—вялікі гонар.

С. Чорная.

Прэзідыум парады жон каманднага і нач. складу пагранічнай і ўнутранай аховы НКВД БССР (Белсаюзфота).

ВУЧУСЯ З РАДАСЦЮ І ЗАПАЛАМ

(ПІСЬМО ОРДЭНАНОСКІ)

Шчаслівая, радасная прыехала я дамоў, у Заслаўскі раён, з Масквы пасля ўсесаюзнай нарады перадавікоў па ільну і канаплі. Дзень і ноч я адчувала на сабе ордэн і гэта надавала мне адчуванне яшчэ большага шчасця.

У нашым калгасе „Звязда" чакала мяне яшчэ адна радасць. Мне прапанавалі паехаць ў Горкі, на курсы памочнікаў камбайнераў.

Вучыцца! Вучыцца—гэта значыць выканаць наказ таварыша Сталіна, гэта значыць авалодваць тэхнікай, гэта значыць дапамагчы краіне даць 7—8 мільярдаў пудоў хлеба за 2—3 гады.

Адно толькі палохала мяне: як я буду авалодваць тэхнікай, калі агульныя веды мае небольш 4 груп? Думала, буду адставаць, сораму не абярэшся. Але я хутка перамагла у сабе палахлівасць і 27 сакавіка паехала на курсы.

— Наступная станцыя—Пагодзіна,—гучным голасам некалькі разоў абвясціў кандуктар.

Маё сэрца перапоўнілася радасцю. Праз хвіліну я сабрала свае рэчы і пайшла к выхаду. Цягнік спыніў свой рух, я адчыніла дзверы вагона, а шумны вецер, нібы жартуючы са мною, вырываў дзверы з рук.

Як толькі я вышла на пляцоўку, незнаёмы голас назваў маё прозвішча і крануў мяне за плячо.

— Вы на курсы помкамбайнераў?

Гэта быў дырэктар сельскагаспадарчага інстытута тав. Пелікан. Разам з ім я прыехала на курсы, якія знаходзяцца пры інстытуце.

Цяпер у мяне такое пачуццё, нібы я некалькі год жыву тут. Харчуюся ў сталоўцы, разам з навуковымі работнікамі. Снеданне, абеды і вячэра вельмі добрыя, грошы за харчаванне не бяруць, яшчэ нават стыпендыі атрымоўваю 80 руб. Жыву ў чыстым, культурным пакоі.

Мне даюцца ўсе ўмовы для вучобы. І я імкнуся добра авалодваць тэхнікай і атрымаць вялікае права на ганаровае званне.

На 15 дзён я спазнілася на курсы. Шмат чаго прайшлі без мяне, але пры актыўнай дапамозе загадчыка курсаў і некаторых выкладчыкаў я лёгка прапрацавала пройдзены матэрыял і зараз лічуся нядрэнным слухачом курсаў.

Я—староста групы. Па дысцыпліне і ўсваенню матэрыялаў мая група займае першае месца, а гэта для мяне—вялікі гонар.

Палітыку, агратэхніку, матэматыку я здала на „добра", а паўднёвы камбайн на „вельмі добра". Зараз вывучаем паўночны камбайн, на якім мне давядзецца працаваць.

Тав. Мандрукевіч.

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) я чытала некалькі разоў.

Я многа думала аб прачытаным. Зараз складаецца новы тып сельскагаспадарчай вытворчасці, і мы, авалодваючы тэхнікай сельскагаспадарчых складаных машын, павінны гэта моцна запомніць. І таму я ўзяла на сябе абавязацельства выпрацоўваць на паўночным камбайне па 11—12 га ў дзень замест плана ў 7—8 га. Устаноўленыя пленумам тэрміны ўборкі абавязалася выконваць датэрмінова.

Новай хваляй бадзёрасці і энтузіязму напоўніў мяне праект сталінскай Канстытуцыі.

Права на адукацыю, права на працу, права на адпачынак—гэта тое, што даступна толькі совецкаму грамадзяніну і грамадзянцы. Поўнае роўнапраўе жанчыны, поўная магчымасць працаваць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі—усё гэта магчыма толькі ў нас, у непераможнай краіне соцыялізма.

І так радасна ў мяне на сэрцы! Радасна вучыцца і радасна будзе вяртацца дамоў, у прыгожую, светлую хату, якую пабудавала для мяне праўленне калгаса.

Каця Мандрукевіч.

ДА ЎСЕНАРОДНАГА СВЯТА

Нярадасным было дзяцінства т. Асоўскай. Бацька не мог пракарміць вялікую сям'ю на свой заробак і вымушан быў паслаць працаваць дзевяцігадовую дачку.

Цяжка было дзяўчынцы на цукернай фабрыцы прыватніка. Не гледзячы на ўзрост, яе прымушалі працаваць па 10—11 гадзін у дзень. Яна завёртвала цукеркі, прыбірала памяшканне, бегала ў краму і моўчкі перанасіла ўсякія крыўды.

Кастрычніцкая рэволюцыя зруйнавала старое і стварыла новае жыццё для ўсіх працоўных. Новым жыццём жыве зараз і Асоўская.

Ужо 10 год працуе яна на фабрыцы „Чырвоны харчавік". Цяпер тав. Асоўская—лепшая стаханаўка фабрыкі і перадае свае веды маладым работніцам. Яна ўжо навучыла 25 работніц, якія таксама працуюць па-стаханаўску.

Да надыходзячага ўсенароднага свята 11 ліпеня т. Асоўская ўжо даўно пачала рыхтавацца. Яна сшыла сабе прыгожую вопратку і мяркуе на свята запрасіць да сябе сваіх таварышак. Тав. Асоўская ўзяла на сябе абавязак навучыць працаваць яшчэ 25 чалавек, давесці выкананне новых тэхнічных норм не менш чым на 210 проц. Гэта ўсё яна выканае, каб дабіцца права падпісаць пісьмо любімаму настаўніку таварышу Сталіну.

Ю. Баравікова.

Бабруйск.

Аб узнагародзе актывістак — жонак спецыялістаў і адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў сельскай гаспадаркі

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

За ініцыятыву, праяўленую ў справе ўцягнення жонак спецыялістаў і адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў соўгасаў і МТС у грамадскую работу па культурна-бытавому абслугоўванню рабочых і служачых МТС і соўгасаў і энергічнае разгортванне гэтай работы, узнагародзіць граматамі ЦВК і СНК БССР наступных таварышоў:

1. Сукач Ніну Васільеўну—жонку дырэктара Заслаўскай МТС.

2. Рагачову Кацярыну Нікіцічну—жонку каваля, стаханаўца соўгаса „Брылёва", Гомельскага раёна.

3. Левіну Дору Ісаеўну—жонку дырэктара Рудзенскай МТС.

4. Любаўцову Анну Іванаўну—жонку нач. палітаддзела соўгаса „Свердлова", Дзержынскага раёна.

5. Маршаву Ольгу Філіпаўну—жонку сакратара Гарадоцкага РК КП(б)Б.

6. Сцепаненка Анну Цярэнцеўну—жонку дырэктара Старадарожскай МТС.

7. Меерсон-Рубенчык Эму Грыгораўну—жонку начальніка палітаддзела соўгаса „Свердлова".

8. Берговіну Александру Аляксееўну—жонку дырэктара конесоўгаса 59, Гомельскага раёна.

9. Галубкову Елену Александраўну—жонку нач. палітаддзела соўгаса „Палелюм", Барысаўскага раёна.

10. Сямёнаву Марыю Нікалаеўну—жонку ст. бухгалтара соўгаса „Лагаза", Лагойскага раёна.

11. Кісялёву Агаф'ю Александраўну—жонку сакратара парткома Горацкага сельскагаспадарчага інстытута.

12. Эльпер-Беленькую Любу Майсееўну—жонку дырэктара Капыльскай МТС.

13. Шпакову Анастасію Паўлаўну—жонку пам. начальніка палітаддзела соўгаса „Чачэвічы", Быхаўскага раёна.

14. Вальдэнберг Анну Іванаўну—жонку загадчыка аддзела дробнай жывёлагадоўлі Наркамзема БССР.

15. Дабравольскую Соф'ю Васільеўну—жонку дырэктара Жлобінскай МТС.

16. Маславу Надзежду Парфёнаўну—жонку ст. агранома Хоцімскай МТС.

17. Гонтар Параскоўю Васільеўну—жонку ст. механіка Пухавіцкай МТС.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. Чарвякоў.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. Ляўкоў.

21 чэрвеня 1936 г.
г. Менск, Дом урада.

Калона менскіх фізкультурніц. (Белсаюзфота).

Новы атрад барацьбітоў

Сакратар ЦК КП(б)Б т. Валковіч у прэзідыуме ўсебеларускай нарады жон спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Злева—тав. Сукач, справа—т. Левіна.

Многа выдатных людзей нашай ордэнаноснай рэспублікі пабывалі ў вялікай залі Дома ўраду. Многа разоў з трыбуны гэтай залы гордым заклікам гучэлі галасы лепшых сыноў і дачок Беларусі. Гучныя спевы і гарачыя прамовы не раз напаўнялі гэтую залу. Гэта спявалі, гэта выступалі лепшыя працаўнікі нашай ордэнаноснай рэспублікі. Але 19 чэрвеня тут адкрылася незвычайная нарада, нарада жанчын, якія не жадаюць больш быць толькі хатнімі гаспадынямі, калі яны могуць быць гаспадынямі ўсёй краіны.

Звыш 300 чалавек актывістак—жонак спецыялістаў і адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў сельскай гаспадаркі з'ехаліся сюды на нараду, каб падзяліцца вопытам сваёй грамадскай работы, каб сказаць, што яны не могуць быць больш пасіўнымі наглядальнікамі таго многаграннага жыцця, якое бурліць вакол іх. Яны з'ехаліся, каб з гэтай трыбуны заявіць, што сваёй творчай ініцыятыве, вопытнай гаспадарчай руцэ яны знайшлі прымяненне.

Героіка соцыялістычных будняў, большэвіцкае ператварэнне краіны не маглі не захапіць іх. І цяпер гэта—новы атрад актывістак—барацьбітоў за соцыялістычную культуру, за чыстату.

Задоўга да адкрыцця пасяджэння зала стала папаўняцца вясёлымі, шчаслівымі жанчынамі, Незвычайна выглядалі тыя нешматлікія мужчыны, якія прысутнічалі на нарадзе ў якасці гасцей. Яны ціскаліся да сцяны. ўступаючы дарогу вясёлым, прыгожа - апранутым жанчынам. А дэлегаткі, поўныя гонару, з пахкімі кветкамі ў руках, займалі першыя рады.

Першае слова атрымала Ніна Васільеўна Сукач, жонка дырэктара заслаўскай МТС.

— Мы пачалі сваю работу з трактарных брыгад. Мы бралі з сабою мыла, шчоткі і соду і ехалі туды, дзе знаходзіліся нашы трактарныя брыгады. Мы наводзілі парадак, чыстату і гэты парадак ўвесь час падтрымоўваўся трактарыстамі. Але мы не забываем, што вораг блізка і таму мы вывучаем стралковую справу, дапамагаем пагранічнікам у ахове граніцы і гатовы разам з мужамі і братамі стаць на абарону дарагой радзімы.

З вялікім пачуццём гаварыла тав. Рагачова (саўгас „Брылёва" Гомельскага раёна).

— Прызнаюся,—сказала яна,—я ніколі не марыла аб тым, што буду выступаць з такой трыбуны, перад такім вялікім сходам. Толькі ў краіне советаў так радасна і вольна можа дыхаць жанчына,—усхваляваца дадала яна.

Тав. Рагачова расказала аб тым, што сваю работу яны пачалі з ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. Сама Рагачова—ужо некалькі год актыўны член сельсовета. Навесці чыстату, культуру і санітарыю ў сельсовеце—вось якую мэту ставіць яна заўсёды перад сабой.

Тав. Левіна—жонка дырэктара рудзінскай МТС—расказала як жонкі—актывісткі займаюцца не толькі грамадскай работай, але і вывучаюць трактар, каб у патрэбны час замяніць мужэй, калі яны вымушаны будуць пайсці абараняць нашу радзіму.

Апроч гэтага, яны вывучаюць стралковую справу і к 11 ліпеня здадуць норму на „Варашылаўскага стралка".

— Не дадзім свіному рылу сунуцца ў наш совецкі агарод! Мы зможам абараніць нашу краіну!

Тав. Дабравольская — жонка дырэктара жлобінскай МТС—скромна гаварыла аб тым, як жоны — актывісткі арганізавалі паказальную работу сталоўкі. Вынікі відавочны: раней ў сталоўку ніхто не хацеў хадзіць. Толькі 8—10 халасцякоў харчавалася там, а цяпер штодзенна там абедаюць 30—40 чалавек.

З вялікім гонарам расказала тав. Зазюля—жонка камандзіра РСЧА—з якой любоўю жоны камандзіраў вывучаюць ваенную справу. Яны стварылі кавалерыйскі, стралковы і іншыя гурткі. На свята 11 ліпеня яны ўжо выступяць конна на парадзе.

Нікому не аддадзім сваёй краіны,—страсна гучэў яе голас.

Прамоўцы змянялі адна другую. Шмат чаго расказалі яны аб тым, як жанчыны дапамагаюць яслям, дзетсадам, колькі п'ес разучылі, колькі пастановак паказалі, колькі сядзіб азелянілі.

І ва ўсіх выступленнях адчувалася вялікая адданасць соцыялістычнай радзіме, глыбокая ўдзячнасць таварышу Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё.

Кожны прамоўца ўспамінаў імя таварыша Сталіна, кожны пасылаў сваё прывітанне вялікаму арганізатару гіганцкіх перамог і кожны раз шумнымі авацыямі адказвала зала пры ўпамінанні імя любімага правадыра народаў.

З глыбокай прамовай выступіў на нарадзе тав. Галадзед. Старшыня СНК БССР указаў на вялікае значэнне выдатнага руху жонак-актывістак.

Новы атрад барацьбітоў вышаў з Дому ўрада з цвёрдай рашучасцю працаваць яшчэ больш, яшчэ лепш на карысць соцыялістычнай краіне. **Пятроўская.**

Дзякуем таварышу Сталіну

Клопаты аб дзецях

Вельмі жадалі мы паехаць на нараду. Вельмі хацелася паслухаць, як працуюць жанчыны ў другіх раёнах, і пра сваю работу расказаць. Але нас непакоіла думка: як будзе з дзецьмі?

Нам нечага было турбавацца: для нашых малышоў была арганізавана ў гасцініцы дзіцячая комната. З дзецьмі заставаліся кіраўніца і няня з лепшых ясляў Менска. Загадчыца гэтых ясляў тав. Фейгіна часта наведвала дзіцячую комнату. Яна не толькі цікавілася доглядам дзяцей, але і з намі праводзіла гутаркі, як трэба правільна выхоўваць малышоў.

Гэта таварыш Сталін научыў клапаціцца аб дзецях і аб нас мацерах. Нам была прадастаўлена поўная магчымасць ўдзельнічаць ў рабоце нарады і мы ўсе выступалі ў спрэчках.

Нарада і выступленні далі нам вялікую зарадку. Зараз мы яшчэ з большай энергіяй возьмемся за работу.

Дабравольская С. В.—жонка дырэктара Жлобінскай МТС.

Холад Т. В.—жонка дырэктара соўгаса „Завалочыцы" Глускага раёна.

Сцефановіч Н. М.—жонка дырэктара соўгаса „Брылёва" Гомельскага раёна.

У чаканні дванаццатага

17-гадовай дзяўчынкай вышла замуж Аўдоцця Кузьмінішна Шарамет. Першага сына Валодзю яна нарадзіла ў 1913 годзе, на наступны год нарадзіла дачку Варку, а потым праз малыя прамежкі часу нарадзіла яшчэ дзевяць дзяцей.

Толькі адно дзіцё памерла. Астатніх усіх выгадавала Аўдоцця і працуюць дзеці яе на карысць соцыялістычнай радзімы.

Старэйшы сын ужо год як пільна ахоўвае межы Совецкага Саюза.

Дачкі Вара, Маня і Ліда ўдарна працуюць у калгасе. Ліда на праполцы выконвае дзве нормы ў дзень.

Прыклад работы для ўсіх паказвае даярка Маня. Да 15 чэрвеня яна выпрацавала 214 працадзён.

Не адстае ад сваіх дачок і бацька—Пятро Шарамет. Ён лістаносец і старанна дастаўляе пісьмы і газеты сваім калгаснікам.

Самаму малодшаму сыну Аўдоцці—Ване—2 гады. Ён здаровы, вясёлы хлопчык. А Аўдоцця Кузьмінішна зараз чакае дванаццатае дзіця. Яна ўжо ўсё падрыхтавала да яго нараджэння.

Шчыра дзякуе Аўдоцця вялікага Сталіна за клопаты аб жанчыне-мацеры і аб дзецях.

М. Жук.

Калгас імя Кагановіча, Смалявіцкі раён.

Дзеці ўдзельніц усебеларускай нарады жон спецыялістаў сельскай гаспадарцы—у дзіцячай комнаце у гасцініцы.

ПАБОЛЬШ ДЗЯЦЕЙ, ПАБОЛЬШ УНУКАЎ

У клубе на адкрытай верандзе вялася гутарка. Гэта ўслед за мужамі для распрацоўкі законапраекта аб забароне абортаў, сабраліся жонкі рабочых, стаханаўцаў і ІТР Менскага варштатабудаўнічага завода імя Варашылава.

—Дзе гэта можна бачыць, каб урад так клапаціўся аб здароўі матцеры і дзяцей—казала т. Шэйніна, жонка рабочага стахановца.—Памятаю сваё ўласнае жыццё—нярадасным яно было. Зараз я шчаслівая са сваімі дзецьмі. Вучацца яны ў мяне. Старэйшаму сыну 15 год, ён добра вучыцца. І таму вітаю новы закон, які сапраўды выяўляе бацькаўскія клопаты партыі і таварыша Сталіна аб нас, жанчынах, і нашых дзецях.

У абмеркаванні законапраекта прымала ўдзел дэлегатка Усесаюзнай нарады жонак ІТР Паўліна Іосіфаўна Лоскат.

— Я вітаю пункт закона аб забароне абортаў,—усхвалявана заявіла яна.—Аборт—гэта найвялікшае зло для жанчыны, пасля яго многія жанчыны застаюцца бяздзетнымі, а гэта—вялікае няшчасце. Вось я хоць абортаў і не рабіла, але ў мяне толькі адзіны сын. Ён інжынер, яго жонка таксама інжынер. І я вельмі, вельмі шкадую, што больш аднаго не нарадзіла! Вось я і наказала сыну і нявестцы пабольш дзяцей мець.

Дар'я Нікалаеўна Шолкава—жонка дырэктара завода—прапанавала арганізаваць пры клубе дзіцячы пакой, які-б абавязкова працаваў штодзённа вечарам, а ў выходныя дні з раніцы да вечара. Гэта дасць магчымасць жонкам прыняць больш актыўны ўдзел у грамадскім жыцці завода.

Тав. Сегальчык унесла прапанову аб выдачы аднаразовай дзяржаўнай дапамогі пры нараджэнні 5-га дзіцяці, замест восьмага.

— Мужы абавязаны дапамагадь жонкам—сказала тав. Разоўская, а ў нас часта звальваюць ўсю работу на жонку. Вось напрыклад: начальнік цэха шырспажыва т. Ключ заўсёды бывае „заняты", а жонцы прыходзіцца сядзець з дзецьмі дома.

Аб забароне абортаў гаварыла Геня Данілаўна Айзман—старшыня совета жонак ІТР і стаханаўцаў завода.

— Я вітаю забарону абортаў. Многія жанчыны лёгкадумна падыходзяць да гэтай аперацыі, якая калечыць жанчыну. Але разам з тым, неабходны самы ўважлівы падыход да кожнай жанчыны—маці паасобку.

Гэтая надзвычайная гутарка зацягнулася вельмі позна. Ды яно і нядзіўна, наш урад перадаў на спецыяльнае абмеркаванне праект закона, які мае велізарную важнасць. Гэта магчыма толькі ў нас, у краіне пераможнага соцыялізма.

Фелер.

Стаханаўка ташкенцкай швейнай фабрыкі т. Іганбердыева, якая чакае шостае дзіця, горача вітае праект пастановы аб забароне абортаў.
(Саюзфота).

Я ўспамінаю

(ПІСЬМО КАЛГАСНІЦЫ)

Да вялікага свята 11 ліпеня, свята вызвалення Беларусі ад белапалякаў мне хочацца падзяліцца з вамі аб перажытым.

У пачатку лютага 1920 года ў вёску Радуша прыехала вялікая колькасць чырвонаармейцаў. Мы, жыхары, хутка прывыклі да іх, як да сваіх родных сыноў. Але 4 сакавіка ў 10 гадзін вечары нечакана па ўсёй вёсцы хутка пранеслася вестка аб набліжэнні белапалякаў. Праз некалькі хвілін чырвонаармейцы пакінулі нашу вёску.

Мы вельмі плакалі, калі развітваліся з Міхасём Кабзуновым—чырвонаармейцам, які быў у нас на кватэры. Ад'язджаючы, ён супакоіў нас:

— Не турбуйцеся, мы вас не пакінем, праз 2—3 дні мы вернемся зноў да вас.

Ніколі не было ў вёсцы столькі слёз, як у гэты дзень. Вялікае хваляванне ахапляла жыхароў вёскі, яны збіраліся групамі па 5—10 чалавек і раіліся, што рабіць. А потым усе арганізаваліся, узброіліся хто чым папала і пайшлі у партызаны.

У вёсцы засталіся толькі непрацаздольныя старыкі, якія таксама гатовы былі рабіць усё, каб не дапусціць абнаглелых белапалякаў, бо пра іх здзекі з працоўнага сялянства яны ведалі раней.

Марозная, месячная ноч давала магчымасць распазнаць пад'язджаючыя войскі. Жыхары вёскі як адзін пазахаваліся ў хаты і толькі праз вокны назіралі за 2-кілометравым ланцугом польскай арміі, якая праходзіла ў вёску Змеёўку. Некаторыя белапалякі засталіся і ў нашай вёсцы—Радуша.

Ламанне дзвярэй, крык і плач насельніцтва перапоўнілі вёску. Я вельмі перапалохалася і доўга не адчыняла дзвярэй, але нарэшце вымушана была адчыніць. І як толькі яны ўварваліся ў нашу кватэру, то адразу пачалі збіваць нас, вязаць свіней, цялят, рэзаць кароў. Яны рабавалі ўсё, што траплялася ім пад рукі. Скрыні пакідалі пустыя. У мяне нават хацелі забраць апошні тулуп, але я не аддала, хоць за гэта атрымала шмат пабояў. Яны прымушалі засмажваць курэй на снеданне ім, і за невыкананне збівалі плёткамі.

За 2 гадзіны белапалякі абрабавалі вёску, а калі ад'язджалі,—запалілі нашы хаты.

Галоўны штаб партызан знаходзіўся ў вёсцы Амельні. Атрады былі аб'яднаны ў асобныя партызанскія батальёны. Пылаючы ненавісцю да паноў-бандытаў, партызаны без страха лезлі прама на ворага. Сярод партызан былі старыкі з багатым ваенным вопытам, была моладзь, былі і жанчыны, і падлеткі—дзеці. Усе яны аддана, па-геройску змагаліся за аслабаненне сваёй бацькаўшчыны ад белапалякаў.

6 сакавіка палякі былі прагнаны з вёскі Радуша. Гэта ніколі не забыць нам.

У мяне трое сыноў, двое з іх ударна працуюць у калгасе, адзін служыць у органах НКУС. Мне самой ужо 50 год, але ў любы момант я гатова, разам з імі, ісці абараняць нашу соцыялістычную бацькаўшчыну.

Аксіння Пабалавец.

Жлобінскі раён,
калгас „Чырвоныя Радушы"

У калгасе імя Сталіна Астрашыцка-Гарадзецкага сельсовета, Менскага раёна, другі год працуе начн калгасны санаторы.
На здымку: калгасніцы Ніна Квяткова і Насця Макейчык, адпачываючыя ў санаторыі, гуляюць у більярд

Цана 20 кап.

754

Удзельніца выстаўкі украінскага народнага мастацтва калгасніца-мастачка Параска Уласенка.

Адказны Рэдактар М. І. Волгіна

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 800. Тыраж 11.740. Уп. Галоўлітбела № Ш—3269
Здана ў набор 25/VI—36 г. Падпісана да друку 8/VII—36 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.